Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Наша Праўда

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і [...]рацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (W[...]eńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 23 Вільня, Серада 22-га чэрвеня 1927 г. Год I

Вынікі выбараў у Вільні.

19-га чэрвеня адбыліся выбары ў віленскую мястовую раду.

Усяго пададзена 59,904 галасоў, якія раскладаюцца на паасобныя сьпіскі гэтак:

1.	расейска-белар.	1,608 гал.—	1 манд.
2.	П. П. С.	11,434 „ —	9 „
3.	жыдоўскіх жанчын	627 гал.	0 манд.
4.	Бунд	3,499 „	3 „
5.	літоўскі	1,012 „	1 „
6.	Поалей-Цыон	313 „	0 „
7.	„Абароны правоў работніка“ (фікцыйны сьпісак манархістаў)	102 гал.	0 манд
8.	Жыдоўскі Нац. Блёк	10,525 гал.	9 „
10.	„Санатары“(пілсудчыкі)	5,892 „	5 „
12.	манархісты	5,372 „	4 „
14.	эндэкі	13,636 „	11 „
15.	*Аб'яднаны Работніцкі Камітэт*	*5,886* „	*5* „

Паводле сьпіску № 15 прайшоў на 4 месцы кандыдат Беларускага Выбарнага Камітэту *Кузьма Крук*, беларус, каапэратыўны дзеяч.

На расейска-беларускім сьпіску № 1 кандыдатура Ярэміча праваліласяя. З гэтага сьпіску прайшоў толькі адзін кандыдат — прадстаўнік „единой русско-бѣлорусской національности“ і ведамы праваслаўны царкоўны дзеяч сэн. Багдановіч, дый то толькі затым, што „Сялянская Ніва“ *ашуканствам адарвала ад сьпіску № 15 частку галасоў выбаршчыкаў-беларусаў*, абвясьціўшы напярэдадні выбараў, быццам на сьпіску № 15 *беларусаў няма*, і быццам дзеля гэтага беларускія работнікі пастанавілі галасаваць за № 1.

Па сьпіску № 15 прайшлі ў мястовую раду гэткія асобы: 1) Ал. Заштовт, інжэнер, 2) Ал. Дзідзюль, шавец, 3) Канстанты Лапушынскі, ўрадовец, 4) Кузьма Крук, каапэратар, 5) Галіна Заштовт-Сукеньніцка, доктар права.

Неспадзяванкай зьяўляецца вялікая лічба галасоў, якую атрымаў сьпісак П.П.С.—правіцы. Тлумачыцца гэта тым, што пад сьцягам П.П.С., якая ведама сваім згодніцтвам з буржуазіяй, пайшлі на выбары ў значнай меры чыста буржуазныя інтэлігенцкія элемэнты.

Бясспрэчна дадатнім фактам будзе ўваход у мястовую раду прадстаўніка літвіноў, ведамага культурнага працаўніка д-ра Шлапэліса.

Больш падробна затрымаемся на віленскіх выбарах у чародным нумары.

Стыхійная катастрофа.

Над Заходняй Беларусяй 12 і 14 чэрвеня двойчы пранесься страшэнны сілы ўраган, які зьніштожыў шмат дабра, забіў ды пакалечыў некалькі людзей і многа скаціны.

Аб разьмерах гэтага ўрагану казаў, прыехаўшы ў Вільню, віцэ-ваявода Парафьяновіч. Усяго стратаў пакуль-што налічана на 5 мільёнаў злотых, але гэта яшчэ ня ўсё, бо, з прычыны зьніштажэньня тэлефоннай сеці, з многіх месц весткі яшчэ не атрыманы.

Найбольш пацярпеў Наваградзкі павет. Пасьля — Слонімскі, Стаўпецкі і Лідзкі. Менш — Баранавіцкі. Абмінуты зусім Валожынскі і Нясьвіжскі.

Ураган быў такі сільны, што вялізарныя каменьні кідаў, як лісткі; у адным месцы, дзе стаяла кузьня, ня можна знайсьці навет сьледу яе. У Наваградзкім пав. збурана 240 дамоў, у Слонімскім—200, у Стаўпецкім—50. У в. Боханаўка зьніштожаны 32 будынкі, навет сарваны падлогі. Там-жа 2 людзей забіла, 2 цяжка раніла. У Наваградзкім пав. забіты 2. У Слонімшчыне цяжка ранены 3. Агулам ранена каля 100 асоб.

У Лідчыне зьніштожана шмат пасеваў. У Стаўпецкім пав. зьніштожаны каля 500 гэктараў, у Наваградчыне—4.000 гэкт. Паламана каля 1000 гэкт. лесу. Сарваны масты ў шмат месцах ды зруйнавана маса пачатых будаваньняў.

Пад Наваградкам ўраган вырываў старыя ліпы з карэньнямі, як пятрушку. На цэлыя вёрсты зямля быццам узарана вялізарным плугам.

Ураган быў з градам; градзіны даходзілі да паўтара курыных яец.

Ярыну яшчэ ёсьць час адзеяць нанова.

Банк Рольны асыгнаваў на насеньне — 200.000 зл., але гэта, пэўне-ж,—капля ў моры.

Ураган пранесься пасам у 2 кілямэтры ўшыркі — па крывой лініі, абмінуўшы Наваградак.

Ніжэй падаем апісаньне градабіцьця ў Лідчыне, прысланае сьведкай няшчасьця.

Апавяданьне сьведкі няшчасьця.

(в. Зачэнічы, Бяліцкай вол., Лідзкага пав.).

У аўторак, 14-га чэрвеня каля 4-х гадзін вечара выпаў град, ды такі сільны, якога ня помняць найстарэйшыя людзі ў вёсцы. Велічыня паадзінокіх градзін была ў паўтара курынага яйца. Ува многіх хатах павыбіваны вокны. Куры, якія ня ўсьпелі схавацца, былі пазабіваны на месцы. Скаціна не магла трываць на полі і, як магла, уцякала дамоў, уся пакрытая гузамі, панабіванымі градам. Надворкі пакрыліся густым пластом лёду. Зараз вуліца перарабілася ў раку.

Град трываў каля 20 мінут. Жыта паламана і скручана, ярына зьбіта і павыварочвана з карэньнямі. Месцамі ня знаць нічога, што было пасеяна.

Град захапіў паласу ў вёрст дзесяць шырыні і як чутно, вёрст 100 даўжынёю, прыблізна ўдоўж Нёмна з боку Мастоў на ўсход, на шчасьце на палавіну лесам, які таксама пакрышыла. Шырыня паласы захапляла 3—4 вёскі.

Навакола вёскі Зачэнічы, як чутно, панішчаны пасевы ў вёсках: Страла, Краглі, Нагародавічы, Гезгалы, Каршакі, Вусьце і Сарапіне. Найбольшыя спустошаньні аказаліся ў Нагародавічах, дзе ўсё поле перароблена ў гладкі ток. Масты ў рэчцы, якая працякае праз гароды, усе зьнесены. Дрэвы вывернены з карэньнямі, засьцілаючы сабою вуліцу, якую трэба было працярэбліваць.

Вёску апанаваў смутак. Леташні год у гэтай мясцовасьці быў недарод. Чакалі новага ўраджаю, які меўся быць вельмі добрым. Цяпер поле трэба нанова пераворваць і засейваць хіба-ж якімі травамі.

Мясцовыя дзеячы зварочваюцца да ўсяго беларускага грамадзянства аб дапамозе, якую наразе просяць надсылаць на імя сябра сэйміку Наваградзкага павету Івана Коскі: p. Zdzięcioł, pow. Nowogródzkiego, wieś Uście.

Досыць цікавае здарэньне, што палеткі вялікіх двароў нейкім дзівам мала пашкоджаны. Сяляне горка сьмяюцца, што паны — лепшыя і ў бога.

Апроч граду 14 чэрвеня—многа спустошыў у ваколіцы ураган 12 чэрвеня. Расказваюць, што ў в. Сачаўляны, Дзятлаўскай вол., пазносіла і раскідала шмат дамоў, у суседнім дв. Явар — разбурыла царкву. Носяцца проста мала праўдападобныя чуткі аб самым працэсе руйнаваньня, напр. як сьвяшчэньніка Яварскай царквы занясло дзесьці далёка ад клябані ў кусты, як скаціну і пастухоў ў поле пабіла, як цэлыя хаты насіла ў паветры. У расказах пераплятаюцца — праўда з вымыслам, адчай і гумар.

Сумныя жарты! Запраўды неабходна хуткая помач і то, як грамадзкая, гэтак і ўрадовая.

Д-н.

Памажэце вёсцы!

Паводле апублікаваных у польскай прэсе паведамленьняў Галоўнае Статыстычнае Управы, для Заходняе Беларусі сёлетні год будзе дужа цяжкі. Ад благога надвор'я і халадоў стан пасеваў к канцу мая месяца шмат паблажэў, раўнуючы з папярэднім месяцам. На ўсю Польшчу *найгоршых ураджаяў* спадзяюцца *ў беларускіх ваяводзтвах—Віленскім, Наваградзкім і Палескім*.

Так кажа афіцыяльная статыстыка. Але, каб у поўнай меры ацаніць жудаснае значэньне гэтага паведамленьня, трэба прыпомніць яшчэ й тое, што акурат Віленшчына і Наваградчына ўжо крэпка пацярпелі ад леташняга недароду, што Заходняя Беларусь наагул дагэтуль не паднялася з паваеннае руіны, што й па сёньняшні дзень на вялізарным прасторы народ яшчэ ня мае хат і гніе ў зямлянках. Трэба дадаць, урэшце, апошнія жудасныя факты стыхійных катастрофаў у пяцёх паветах Заходняе Беларусі і тады толькі здолеем ацаніць, як сьлед, утварыўшаеся палажэньне.

Што-ж рабіць? Як бараніцца ад тых страшных насьледкаў, якія заўсёды нясе з сабой неўраджай?

Ведама, справа гэтая — ня лёгкая. Калі летась неўрадзіла толькі ў Віленшчыне і частцы Наваградчыны, калі прынамся палова Заходняе Беларусі была болей-меней забясьпечана сваім хлебам,—дык сёлета недарод пагражае *ўсяму краю*. І ясна, што насяленьне краю само сабе нічым дапамагчы ня можа, — ясна, што трэба шукаць дапамогі па-за межамі Заходняе Беларусі.

Дзе-ж яе шукаць?

Пасеўныя пазыкі, якія сёлета даваў урад, паказуюць, што вялікае дапамогі з гэтага боку трудна спадзявацца. Даволі прыпомніць і тое, што навет польская абшарніцкая прэса мусіла сцьвярдзіць: што чацьвертую частку асыгнаванае на пасеўныя крэдыты сумы ўзялі сабе—за пасрэдніцтва!—польскія банкі і банчкі, створаныя дзеля „апекі“ над беларускай вёскай. Дык трэ зьвярнуць увагу на наладжаньне ня толькі дзяржаўнае, але й *грамадзкае* дапамогі нашаму многапакутнаму сялянству.

Як гэта зрабіць?

Гадоў 25 назад, калі ў Расеі быў вялікі неўраджай і голад, дапамога йшла з-за акіяну — з далёкае Амэрыкі. У Лібаву і другія Балтыцкія порты прыходзілі тады вялізарныя акіянскія параходы, нагружаныя амэрыканскім хлебам, празначаным для галоднага народу. І гэту праяву людзкага спачуцьця расейскаму сялянству ўсе віталі вельмі горача, а ўрад вялікае, магутнае Расейскае Імпэрыі ня бачыў у гэтым нічога крыўднага для сябе. Няўжо-ж беларускае сялянства ня мае права на гэткі-ж спогад з боку другіх народаў? Няўжо-ж у Польшчы, якая непрыраўнальна бяднейшая за колішнюю дзяржаву маскоўскіх цароў, можа хто-колечы супрацівіцца гэтаму?

Але мы, беларусы, на асаблівы спогад маем права спадзявацца з боку нашых родных братоў — ад тае часткі Беларусі, якая адрэзана ад нас гранічнымі межамі і жыве тамака самастойным жыцьцём у саюзе з самастойнымі-ж народамі былое Расеі. Да іх мы і кіруем перадусім наш кліч аб дапамозе.

Беларускае грамадзянства наабапал граніцы, што падзяліла нашу Бацькаўшчыну, павінна падняць свой голас і распачаць шырокую—*ў міжнародавым маштабе*—акцыю зьбіраньня дапамогі для Заходняе Беларусі. І трэба пачаць гэту акцыю неадкладаючы, чым хутчэй: ужо цяпер ураганам зьнішчаны цэлыя вёскі, дый не пара будзе займацца зборамі тады, калі выявяцца ўжо рэзультаты неўраджаю—калі людзі пачнуць галадаць, калі ня будзе чым з восені абсеяць поле.

Апрача беларусаў, якія жывуць у Радавай Беларусі, значная частка нашага народу пакінула Стары Сьвет і перабралася ў Новы—ў Амэрыку. Вось, там трэба таксама распачаць арганізацыю зборкі хлеба для Заходняе Беларусі,—і мы думаем, што на такую справу ніводная рука ня ўхіліцца ад дапамогі.

Каб павясьці шырокую акцыю ў кірунку зьбіраньня ахвяр на дапамогу нашаму сялянству, пацярпеўшаму ад стыхійных катастрофаў, патрэбна адумысная грамадзкая арганізацыя і ў самым нашым краю. Мы маем такую арганізацыю ў асобе Беларускага Т-ва Дапамогі, і мы перакананы, што яна, як сьлед, выпаўніць сваю важную і адказную задачу, маючы падтрыманьне ўсяго нашага грамадзянства.

Як мы і прадказавалі, „Сялянская Ніва“ ў справе выбараў у гмінныя самаўрады зыйшлася на адным супольным „агульна-нацыянальным“ фроньце з паўлюкевічаўскім „Беларускім Словам“: абедзьве групы, якія гуртуюцца ля гэтых бясслаўных часопісяў, не спадзяюцца інакш правясьці сваіх кандыдатаў, як убіўшыся ў кампанію ідэйных беларусаў. І Паўлюкевіч, і Рагуля з Ярэмічам паўтараюць усё тыя-ж лёзунгі „еднасьці ўсіх беларусаў“.

Дык перасьцерагаем працоўнае сялянства перад гэнымі асаблівымі згоднікамі, якія лішне ўжо ясна паказалі ўсей сваей дзеяльнасьцяй, што служаць не свайму народу, а... самым сабе!

Рэзультаты працы Рады Лігі Народаў.

Рэзультаты апошняй, так хутка закончанай з прычыны раптоўнага ад'езду ў Парыж Брыяна (быццам дзеля вейкай „хваробы“!)... сэсіі Рады Лігі Народаў — пазытыўна вельмі малыя. За тое банкруцтва ўсяе ўстановы Лігі паказава было ўсяму сьвету ўжо зусім бясспрэчна. Бяссільле і банкруцтва Лігі сцьверджана асабліва ярка тым, што Рада навет не пасьмела паставіць на парадак дня справы канфлікту Югаславіі з Альбаніяй, за якой стаіць Італія,—бо-ж за гэтай апошняй стаіць магутная павадырка Лігі — Англія... Усе крывіцы згодна сцьвярджаюць, што Югаславія і Італія адкрыта рыхтуюцца да вайны, якая можа выбухнуць у кожны мамэнт, — а вось Рада Лігі навет і не прабуе ўмяшацца ў канфлікт, каб прынамся выясьніць тое, што запраўды-ж робіцца, шукаць спосабаў спыненьня небясьпекі... Чаму-ж гэта? Бо Італія заявіла, што ня хоча, каб у Лізе была гутарка аб яе правакацыях у Альбаніі; Англія падтрымала яе, бо інакш выявілася-б і яе агідная роля. І вось, Ліга сьпіць сабе ў шапку, а ў Альбаніі ўжо гарыць, абліты італьянскай нафтай ды падпалены ангельскай серначкай, цэлы кут Балканскага гмаху... А з гісторыі ведама, як лёгка з Балканаў агонь перакідаецца на ўсю Эўропу, калі не на ўвесь сьвет...

Ня кажам ужо аб кітайскай бойні, якая ўжо зусім ня цікавіць ані Лігу, ані яе Раду. А, здаецца ж, Кітай—паўнапраўны сябра Лігі! А здавалася-б, — Ліга мае заданьнем, паводле свайго пекнага Статуту, не дапускаць ды спыняць ваенную небясьпеку... Дык ясна, што пасьля гэтай сваей маральнай сьмерці Ліга ўжо не паўстане да запраўднага жыцьця: так крывадушна лгаць ды ашуківаць увесь сьвет бяскарна ня можна!

Фактычна Ліга ўжо скончыла сваё дзейнае самастойнае жыцьцё, і асталася яшчэ толькі (—як вельмі выгадная часамі!) вывеска ці шырма, на якой адбудаваўся, як беларуская прэса сцьвярдзіла ўжо даўно, — стары, ведамы добра, — даваенны „канцэрт“, ці па просту—хэўра вялікіх дзяржаваў. Дык у запраўднасьці ўсе справы вырашаюцца па-за Лігай, ды па-за Радай — на сакрэтных нарадах вялікіх дзяржаваў, на якія гэтыя дзяржавы магнаты запрашаюць, згаварыўшыся між сабой, тых ці іншых „панкоў“ ды „падпанкаў“, якія маюць голас толькі пастольку, паскольку іх хочуць слухаць вялікія магнаты.

Канкрэтна гэтая чэрвянёвая Рада зрабіла страшэнна мала. Падобна да праўды тое, што піша адзін францускі публіцыст, — што Рада вырашыла да канца можа толькі адну справу: справу кантролю збураных немцамі крэпасьцяў на нямецка-польскай граніцы. Як мы пісалі, у гэтай спорцы між Нямеччынай і Францыяй ды Польшчай — перамога Нямеччыны поўная! Францыя ўступіла цалком, а польскай прэсе асталося толькі кісла абурацца на прызнаны „прэсьціж“ (павагу) Нямеччыны, як вялікай дзяржавы, яе калегамі... Справа ў тым, што вялікія дзяржавы прынялі пункт гледжаньня Штрэзэмана, што, калі нямецкі ўрад сам сьцьвярджае афіцыяльна факт збурэньня крэпасьцяў, дык павага Нямеччыны, як вялікай дзяржавы ня можа дапусьціць у гэтым ніякага сумліву, а ў кожным разе ня можа быць мовы аб якімсьці кантролю з боку між саюзнай камісіі, ці спэцыялістаў Рады Паслоў, ці наагул заінтэрэсаваных дзяржаў. Бо ж гэткі кантроль 31 студзеня спынены раз назаўсёды. З-пад усялякага асаблівага нагляду былых пераможцаў Нямеччына ўжо выйшла, прынамся на сваей неакупаванай тэрыторыі. Сам Штрэзэман запрапанаваў кампраміс: каб былыя крэпасьці былі агледжаны амэрыканскім—нэйтральным—спэцыялістам, што і было прынята дзяржавамі (Францыяй).

У справе зьмяншэньня акупацыйных войскаў Нямеччына здабыла таксама, але моменш выразную перамогу: Брыян толькі ўрачыста абяцаў Штрэзэману, што—у паразуменьні з ім — апрацуе пытаньне аб тым, сколькі можна будзе ў бліжэйшы час (трэба думаць—зараз-жа пасьля дакладу амэрыканскага спэцыяліста аб збураных крэпасьцях) забраць жаўнераў з Надрэніі. Прыватна нямецкія крыніцы пішуць, што зараз жа будзе зьменшана акупацыя на 15.000 жаўнераў.

Справа клайпэдзкага (—нямецка-літоўскага) канфлікту таксама зьліквідавана — з перамогай Клайпэды—Нямеччыны: Вальдэмарас на другі дзень пасьля дакладу Штрэзэмана ў Радзе зрабіў такую рашучую заяву, абяцаўшы шанаваць усе правы клайпэдзкага аўтаномнага Сойму, — што Штрэзэман узяў назад паданую ім ў Раду скаргу клайпэдзкага насяленьня.

Палючая справа вострых адносінаў меншасьцяў у Вэнгрыі і Румыніі была ганебна адложана на восень...

Карэспандэнты пішуць, быццам на сакрэтных нарадах вялікія дзяржавы шмат гутарылі аб скліканьні нейкай „канфэрэнцыі ў справе бальшавізму“, ды што быццам навет былі прыняты нейкія пастановы аб гэтым. Але гэта—галіна чутак...

Трэба дадаць, што Штрэзэман, як падаюць розныя крыніцы, вытрымаў супольны націск міністраў-дыпляматаў на чале з Чэмбэрлэнам—у справе адносінаў да Радаў. Як піша польская прэса, ён „выкруціўся ізноў ад прапазіцыі, каб выбіраў між Лёкарно і Рапальлё“. Усё, што выціснулі з яго дзяржавы, гэта — тая паўафіцыяльная адозва, у якой нямецкі ўрад робіць ясную розьніцу між радавым урадам і Комінтэрнам, заклікаючы радавы ўрад выразьней адсэпаравацца ад III Інтэрнацыяналу. Ясна, што свайго саюзу з СССР Нямеччына не прадасьць ні за якую „сачавічную зацірку“...

„Канфэрэнцыя у расейскай справе“.

Нямецкая прэса зацікавілася быццам спароджнным у Жэнэве праекты міжнароднай канфэрэнцыі ў справе расейскай. Правыя нямецкія газэты зачепакоены гэтым праектам, які лічаць творэм францускай дыпляматы; Брыян у змове з Вандэрвэльдэ высунуў ад імя апошняга гэты праект у Жэнэве. У канфэрэнцыю гэтую прэса наагул ня верыць. Бо, калі яна мае адбыцца з удзелам Радаў, дык цяжка верыць, каб здолелі апрацаваць такую праграму яе, на якую згадзіліся-бы адначасна Англія і СССР. Дык астаецца толькі адно: што канфэрэнцыя мела-б быць аб Расеі — без Расеі, ці СССР. А гэта значыць, што Нямеччыне запрапанавалі бы прыняць у ёй удзел на падставе „англійскай праграмы“—проці Радавай Расеі. Нямеччына павінна была б шмат падумаць, ці варта ісьці на гэткую рэч.

Агульны вывад нямецкай прэсы — той, што можна ісьці толькі на такую канфэрэнцыю, у якой будзе прымаць удзел СССР. Тады Нямеччына будзе мець на канфэрэнцыі найбольшую свабоду руху.

Сацыялістычны „Форвэртс“ закідае правіцы, быццам яна гатова прыняць удзел ў нейкіх жэнэўскіх нарадах аб стварэньні проці-бальшавіцкага руху — на карысных для Нямеччыны варунках. Газэта піша, што для Нямеччыны ёсьць толькі адзіная карысная для яе, як і для ўсяго сьвету, роля: гэта — роля пасрэдніка між СССР і Англіяй. У канфэрэнцыі Нямеччына можа прыняць удзел толькі побач з СССР.

Орган канцлера Маркса піша, што маральная ацэнка дзеяльнасьці III Інтэрнацыяналу—гэта адно, а палітычныя адносіны да Расейскай Дзяржавы (СССР) — гэта нешта іншае. Зусім магчыма, што Нямеччына далучыцца да супольнага заяўленьня пратэсту ўсяго цывілізаванага сьвету проці тасаванай у Маскве сыстэмы тэрору. Гэта-ж ня было-б навет зусім актам варожым да СССР, бо такая рада маскоўскаму ўраду — не тасаваць сыстэмы тэрору, якая абурае проці СССР увесь цывілізаваны сьвет,—была-б запраўды зычлівай услугай Радам. Але палітычная сутнасьць адносінаў да СССР для Нямеччыны астаецца нязьменнай. Адмова ад Трактату ў Рапальлё была-б папросту лёгкамысн ай.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Адчыненьне сэсіі Сойму.

У панядзелак, 20 чэрвеня, адбылася першае паседжаньне склікана ўрадам сэсіі Сойму. Напачатку прачытаны дэкрэты Прэзыдэнта, выданыя бяз Сойму. Усе яны пераслалы ў адпаведныя камісіі. — Пасьля Сойм прыступіў да разгляду прапазіцыі ППС у справе звароту Сойму права **распусьціць сябе сваей уласнай пастановай**, якое ён меў раней і якога цяпер пазбаўлены. Прапазіцыя гэта **прынята** большасьцяй галасоў.

Дэкрэты пададзены ў Сойм.

Віцэ-прэм'ер Бартэль пераслаў у Сойм 6 урадавых дэкрэтаў. Рэшта будзе пераслана ў часе трываньня сэсіі Сойму.

Сэнат таксама скліканы.

Сэнат скліканы на 22-га чэрвеня. Першае паседжаньне Сэнату назначана Старшынёй яго на 24-га чэрвеня.

Новы радавы пасол у Варшаве (?)

У сувязі з прыездам у Варшаву з Масквы сэкрэтара радавага пасольства Аркадзьева ў газэтах зьявілася чутка, быццам радавым паслом у Варшаве мае быць сябра Каміс. Замежн. Спраў Стомоняков, які цяпер вядзе з польскім паслом у Маскве п. Паткам перагаворы аб гарантыйным трактаце.

Лічба дэфіцыту за травень.

Падаем, паводле апошніх газэтаў, дакладныя лічбы таргевага балянсу Польшчы за травень. Увоз у Польшчу—163.814 тыс. злотых у золаце. Вываз — 114.177 тыс. Недахоп, ці ад'емны балянс—49.637 тыс. злотых у золаце, гэта значыць—па першапачатнаму курсу 5.18 за даляр. Паводле сучаснага курсу—недахопу на 85 мільёнаў 340 тыс. злотых.

З пазыкай, ясна-ж, ня можна пазьніцца ані на адзін дзень,—бо ж гаспадарчае палажэньне дужа цяжкое.

Прычына ад'емнага таргевага балянсу Польшчы.

Прычынай ад'емнага таргевага балянсу Польшчы, які пагражае ізноў яе валюце, зьяўляецца ў траўні месяцы галоўным чынам, значны ўвоз збожжа. Як відаць з падрахункаў, у траўні ўвезена ў Польшчу ўсяго 143.000 тоннаў збожжа — на 40 мільёнаў залатых злотых (каля 72 мільнаў нашых злотых па бягучаму курсу),—аж на 18 мільёнаў больш, чым у красавіку. Павялічыўся таксама ўвоз... аўтамабіляў. Аднача сна вываз з Польшчы зьменшыўся на $5\frac{1}{4}$ мільён. злотых у золаце. Гэткім чынам зусім ясна, што небясьпечны гаспадарчы недахоп Польшы зьяўляецца рэзультатам шкоднай абшарніцкай палітыкі ўраду, які дазволіў абшарнікам вывезьці з Польшчы збожжа ў восені, а цяпер прышлося ізноў увозіць збожжа, пераважна муку, плацячы падвойныя цэны.

Справа пазыкі.

Газэты падалі — няведама, каторы ўжо раз,—што ў панядзелак мелі прыехаць з Парыжу ізноў у Варшаву паўнамоцнікі банкіраў і дэлегаты Польскага Банку, каб тут нарэшце ўжо зусім аканчальна падпісаць пазыковую ўмову.

Генарал—старшынёй Дзяржаўнага Банку.

Газэты падалі цікаўную для сучаснай Польшчы вестку, быццам на месца старшыні Дзяржаўнага Банку Краёвай Гаспадаркі назначаны... генарал Гурэцкі, ведамы пілсудчык. Быццам назначэньне ўжо падпісана мініст. скарбу ды будзе аканчальна зацьверджана на найбліжэйшым паседжаньні Рады Міністраў. Нешта нeяк аб ген. Гурэцкім, як аб выдатным фінансісьце, ніхто пакуль-што яшчэ ня чуў...

На што не шкадуюць грошы?

„Роботнік“ паведамляе, быццам Рада Міністраў пастанавіла даць адстаўному старшыні Банку Краёвай Гаспадаркі п. Стэчковскаму пэнсіі (эмэрытуру) аж 2500 зл. у месяц. Гэта-ж амаль не ўдвая больш, як атрымліваюць паны міністры. Гэты п. Стэчковскі быў калісьць за першых часоў Пілсудскага—перад новым Соймам — міністрам скарбу. А пасьля—што ён рабіў у гэтым Банку Краёвай Гаспадаркі, якая, як ведама, заўсёды кульгала ў Польшчы на ўсе 4 нагі,—ня было нeяк чутно.

Вялікі камуністычны працэс у Луцку.

17-га чэрвеня скончыўся ў Луцку вялікі працэс „61“, якія вінаваціліся ў тым, што належалі да камуністычнай партыі Заходняй Украіны. Справа цягнулася аж 3 тыдні. Суд прысудзіў 3 на вечную катаргу; 3—на 15 гадоў, 8—на 8 г., 3—на 6 г., 7—на 4 г., 5—на 2 г., і 1—на 1 г. 23 падсудных апраўдалі.

Заграніцай.

Меры латвійскага ўраду ў сувязі з забойствам Войкова

У сувязі з забойствам Войкова латвійскі ўрад сам прыняў рад мераў, каб не дапусьціць магчымасьці паўтарэньня нечага падобнага на тэрыторыі Латвіі. Манархічныя арганізацыі пастаўлены пад асаблівы нагляд адміністрацыі. Рэдактар расейскай газэты „Слово“ Беражанскі высланы заграніцу; высланы таксама яшчэ некалькі расейскіх эмігрантаў — афіцэраў і цывільных. Латвійскі ўрад зьвярнуўся да свайго пасольства ў Варшаве, каб — у разе выдаленьня з Польшчы па трэбаваньню радавага ўраду непажаданых у Польшчы асобаў, яно не давала-б візаў ім на ўезд у Латвію.

Уражаньне ад прысуду ў справе Кавэрды ў Маскве.

„Известия“ абураюцца на вельмі лагодны прысуд даразнага суда ў справе Кавэрды. Даразны суд зрабіў тое-ж, што зрабіў-бы і звычайны суд—на падставе існуючых законаў. Гэткім чынам ясна, што тасаваньне даразнага суду мела мэтай толькі скараціць ды спрасьціць сьледзтва і... пахаваць чым-хутчэй усе канцы ў ваду.

Запярэчаньне радавага агенцтва.

Радавае агенцтва „Тасс“ упаўнаважнена урадам запярэчыць катэгарычна ўсім весткам заграніцных газэтаў аб тым, быццам у Маскве і Ленінградзе ўведзена ваеннае палажэньне, што на Украіне абвешчана мабілізацыя,—дый аб масавых рэпрэсіях у розных местах СССР. Не адпавядаюць праўдзе весткі і аб расстрэлах у Маскве 28 афіцэраў, аб масавых расстрэлах у Уладзівастоку, Чэлябінску, Харкаве, Тыфлісе і інш. Нармальнае жыцьцё ў СССР не нарушалася, ніякіх асаблівых мераў проці выезду і прыезду ў СССР ня прынята. Ніякага масавага ад'езду чужаземцаў няма.

Усіленьне радавай прапаганды проці Англіі.

Як можна было спадзявацца, разрыў Англіі з Радамі толькі страшэнна ўсіліў радавую прапаганду проці Англіі на ўсім сьвеце. Забойства радавага пасла ў Варшаве, у якім радавы ўрад афіцыяльна вінаваціць Англію,

Зацьменьні сонца і месяца.


„...У прыродазнаўчых навуках зьмяшчаецца натуральнае процідзеяньне ўсякім імкненьням рэакцыі, сыстэмам і плянам цемры“.
А. Дыстэрвэг.

Астранамічныя абліченьні паказваюць нам, што на працягу кожных прыблізна 18 гадоў здараецца 41 сонцавае зацьменьне і толькі 29 месячных. Аднак, поўнае сонцавае зацьменьне для пэўнага месца на зямной паверхні можа здарыцца толькі раз у 200 гадоў. Такое поўнае зацьменьне ў нас на Беларусі апошні раз відно было ў першым годзе сусьветнае вайны 8 (21-га) жніўня 1914 году, а цэнтральная лінія паласы поўнага ценю (шырыня якое тады была роўна толькі 140—150 вёрст) праходзіла ў кірунку Рыга-Гэнічэск-Фэадосія праз Вільню-Менск.

Пры сонцавых зацьменьнях, на'т калі яны бываюць цэнтральныя (сонца, месяц і зямля ляжаць на аднэй простай лініі) здараецца, што ня бывае поўнага зацьменьня. Гэта бывае тады, калі месяц знаходзіцца надта далёка ад зямлі; тады вяршок ценю, які падае ад месяца, не дасягае да паверхні зямлі. Месяц тады цалком не пакрывае сонцавага дыску, застаецца незакрытым вузенькі абруч (персьцень) сонца і такім чынам і ў гэтым выпадку бывае толькі часткавае зацьменьне сонца, так званае персьцянёвае. Няпоўныя сонцавыя зацьменьні нічога цікавага не прадстаўляюць, а людзьмі, якія спэцыяльна гэтым ня цікавяцца, на'т могуць быць зусім не заўважаны. Для навукі так сама яны ня так важны, як поўныя.



Шлях конуса поўнага ценю на паверхні зямлі



Зацьменьне месяца. Месяц—L, зямля—T, сонца—S. Месяц у конусе поўнага ценю зямлі.

Пры месячных зацьменьня мы бачым наступны малюнак: зусім ясны да таго месяц ступнёва пачынае зацямняцца (чырванець) з усходняга боку пры чым лінія, якая аддзяляе гэту пацямнелую частку паверхні месяца ад яснае—крывая, бы гэта цень нашае зямлі, якая, як ведама, мае кулявідную (круглую) форму. Урэшце праз нейкі час месяц увесь становіцца цёмна-чырванавым, як быццам закрыты нейкаю чырвонаю хустаю, праз якую аднак відаць яшчэ яго твар. Надта рэдка здараецца, што месяца амаль зусім ня відно, большаю-ж часткаю ён праз увесь час поўнае фазы застаецца цёмна чырванавым. Гэта чырванавае асьвятленьне паверхні месяца падчас яго зацямненьня ёсьць нішто іншае, як сьвятло нашае зямное атмасфэры, якая напоўнена заўсёды большаю ці меншаю часткаю вадзяное пары.

Калі-б зямля наша ня была атулена атмасфэраю, то цень яе быў-бы зусім чорны і месяца падчас поўнага зацьменьня мы ня бачылі-б зусім. Тут, як бачым, тая самая прычына, якая выклікае на маладзіку так званае попельнае сьвятло месяца. (На 2—3 дзень маладога месяца заўсёды можна бачыць пры харошай пагодзе, як побач вузенькага яснага сярпа віднее рэшта паверхні месяца ледзь-ледзь асьветленая шэрым попельным сьвятлом). Аднак поўнае зацьменьне месяца ня ўрэзваецца так глыбака ў памяць чалавека, як поўнае зацьменьне сонца.

Пры зацьменьні (поўным) сонца мы сапраўды бачым нязвычайна прыгожы і магутны малюнак: навакол зацемненага сонца, якое вісіць на сумным тады небе, быццам нейкі чорны кружок, зьяўляецца прыгожая мягка-ясная карона з яе цуцоўнымі косамі (пратубэранцамі); неба прыймае шэра-жоўты колер і выдаецца пакрытым дажджавымі хмарамі; відаць больш яркія зоры, а Мэркур (самая блізкая ад сонца плянэта) цяпер відзён простым вокам і прыгожа сьвеціць каля закрытага сонца; тэмпэратура на зямлі раптам паніжаецца і ўздымаецца вецер; (калі здараецца што да гэтага бушавала бура, дык з мамэнтам зацьменьня раптам зусім заціхне), па зямлі лятуць са скорасьцю кур'ерскага цягніка дзіўныя цені; твар чалавека прыймае трупны колер; жывёлы становяцца неспакойнымі і імкнуцца схавацца пад стрэху; куры садзяцца на седала—словам усё перажывае нейкія дзіўна сумныя, а разам і прыгожыя хвіліны. На жаль гэта толькі кароткія хвіліны, бо найбольш праз $7\frac{1}{2}$ мінут ўсё канчаецца—зьяўляецца першы прамень сонца і ўсё прыймае нармальны від. Часта падчас зацьменьня каля сонца відаць і касматая госьця (камэта), якой ніхто там не спадзяваўся ўгледзіць. Так была адкрыта невядомая датуль камэта Хэдзіва падчас зацьменьня 16 траўня 1882 году ў Эгіпце.

Поўныя сонцавыя зацьменьні маюць вялізарнае значэньне для навукі, гэтыя кароткія хвіліны памагаюць людзям глыбей і дакладней пазнаць тайны прыроды, уцяміць сутнасьць, прычыны й законы бязьмежнага сусьвету, а аднача сна лепш пазнаць і тое, што скрыта ў нашай зямлі.

На 1927 год прыпадае 5 зацьменьняў—3 сонцавых і 2 месячных. У нас, нажаль, будзе відаць з іх толькі два: адно сонцавае (і то няпоўнае)—29-га чэрвеня і адно месячнае (поўнае)—8-га сьнежня.

Няпоўнае (часткавае) зацьменьне сонца 29 га чэрвеня г. г. можна будзе бачыць па сярэдня эўрапэйскаму часу:

1) у Віленскім ваяводзтве ад 5 г. 25 м. да 7 г. 29 м. Найбольшая фаза прыпадае на 6 г. 24 м.

2) у Наваградзкім ваяводзтве ад 5 г. 23 м. да 7 г. 27 м. Найб. фаза прыпадае на 6 г. 22 м.

3) у Беластоцкім ваяводзтве ад 5 г. 22 м. да 7 г. 26 м. Найб. фаза прыпад. на 6 г. 21 м.

4) у Палескім ваяводзтве ад 5 г. 20 м. да 7 г. 24 м. Найб. фаза прып. на 6 г. 20 м.

Падчас найбольшай фазы будзе закрыта больш як $^3/_4$ паверхні сонцавага дыску.

У Англіі (каля Ліверпуля), у Нарвэгіі, у паўночнай Швэцыі і ў Сібіры будзе відаць поўнае сонцавае зацьменьне.

Поўнае зацьменьне месяца 8 га сьнежня г. г. будзе відаць аднача сна на ўсёй нашай паўночнай паўкулі.

Пачатак зацьменьня (ўваход у паўцень) у 15 г. 53 м.

Пачатак поўнага зацьменьня—17 г. 54 м.
Канец поўнага зацьменьня—19 г. 15 м.
Канец наагул зацьменьня — 21 г. 17 м.

Такім чынам поўнае зацьменьне можна будзе пазіраць прыблізна $1\frac{1}{2}$ гадзіны, а наагул зацьменьне працягнецца, як бачым, ад 4 гадз. п.п. да 9 г. вечара.

Увага: Хто захоча сачыць за сонцавым зацьменьнем 29 чэрвеня г.г., мусіць прыгатаваць сабе кусок задымленага (над сьвечкаю ці лучынаю) шкла, бо інача й можна папсаваць сабе вочы, ды й дрэнна відаць. **Р. Астроўскі.**

5 траўня 1927 г.
Вронкі. Цэнтр. вастрог.

даліла масла ў вагонь проці-англійскай прапаганды, на якую скіраваў усе свае сілы Аддзел Прапаганды Камінтэрну. Побач з прапагандай мае быць хутка арганізаваны „тыдзень авіацыі“, які ставіць мэтай стварэньне найвялікшага ў сьвеце паветранага флёту. Рада Народных Камісараў на адным з апошніх паседжаньняў асыгнавала дэманстрацыйна 4.000 чырвонцаў на гэткую будову флёту—замест вянка на магілу Войкова.

Радавае золата ўцякло з Англіі.

У сувязі з разрывам таргових і дыпляматычных зносінаў між Радамі і Англіяй, радавы ўрад загадаў, каб увесь запас радавага золата, які ляжаў дагэтуль у Англіі, быў перавезены ў Нямеччыну,—у найвялікшыя нямецкія банкі. Усяго радавага золата было ў Англіі 100 мільёнаў залатых рублёў. Яно ляжала ў англійскіх банках — дзеля забясьпечаньня розных заказаў радавага ўраду ў англійскіх фабрыках. Разам з заказамі, і золата гэтае пераехала ў Нямеччыну. Аб заказах у Нямеччыне ўжо распачаліся перагаворы радавых прадстаўнікоў з нямецкімі фірмамі. Разрахункі з фірмамі ідуць, як сьцьвярджае нямецкая паўурадавая газэта, не на крэдыт, але—на гатоўку, часткова на крэдыт — толькі на 30 дзён. Англія гэткім чынам пачала ўжо адчуваць скуткі разрыву гаспадарчых зносінаў з Радамі.

Цікаўны выпадак у англійск. парляманьце

„Павага“ англійскага ўраду з яго Балдвінамі ды Чэмбэрленамі ўсьцяж „расьце“. На адным з апошніх паседжаньняў парляманту пасол Партыі Працы Бьюкенэн у сваей прамове выразна заявіў, што афіцыяльныя заявы прадстаўнікоў англійскага ўраду аб тым, быццам Англія ня ўтрымлівае шпіёнаў у Радавай Расеі, — звычайнае лгарства, хлусьня. Гэтая шчырая заява выклікала страшэнную буру на лавах урадавай большасьці. Старшыня парляманту спыніў прамову пасла і выключыў яго з паседжаньня. Пасол Бьюкенэн спакойна падаўся загаду старшыні ды выйшаў з залі.

Самі шчырэйшыя англійцы ня могуць зьнясьці крывадушных заяваў сваіх „карэктных джэнтльмэнаў“—міністраў.

Запярэчаньні французскага і радавага ўрадаў.

У сувязі з рассыланымі ў газэты англійскімі агентамі весткамі аб быццам плянаваным французскім урадам разрыве стасункаў з Радамі, французскі і радавы ўрады апублікавалі згодныя ў зьмесьце запярэчаньні.

Чаго-б хацелася Англіі?

Англійскія карэспандэнты з Рыму пішуць, быццам Італьянскі ўрад мае ў недалёкай будучыні таксама парваць зносіны з Радамі. Пэўна-ж—тады, калі перакананецца ў тым, якія эканамічныя карысьці даў Англіі гэты разрыў з СССР.

Безрабоцьце ў Англіі расьце.

Газэты пішуць, быццам з прычыны забароны ўвозу англійскага вугальля ў Францыю лічба безработных у Англіі ўзрасла на 240 тысяч душ. Трэба дадаць, што значная частка гэтай лічбы безработных створана разрывам англійска радавых гаспадарчых зносінаў, бо на шмат якіх фабрыках спынена праца па выкананьню радавых заказаў.

Рэзультаты выбараў у Ірляндыі.

Выбары ў ірляндзкі парлямант далі гэткія рэзультаты:

Урадавая партыя атрымала 45 мандатаў, партыя Дэ-Валеры—44, Сін-Фэйн—5, Партыя Працы—22, незалежныя—12, фэрмэры — 11, Нацыянальная Ліга—8. Партыя Валеры і Сін-Фэйн—гэта-ж тыя крайнія групы ірляндзкіх незалежнікаў — рэспубліканцаў, якія паднялі паўстаньне, каб аддзяліцца зусім ад Англіі, а перадусім скінуць з краю ўладу англійскага караля. Незалежныя—гэта ж, відаць, вельмі блізкія да камуністаў, якія таксама спагадаюць вызваленчым імкненьням дэ-Валеры. Гэткім чынам аж 61 пасол у парляманьце Ірляндыі—за самастойную і незалежную Ірляндзкую Рэспубліку. Трэба думаць, што рэшта паслоў згрупуецца навакол урадавай групы, творачы ня вельмі значную большасьць прыхільнікаў конфэдэрацыі з Англіяй—на правах доміній. Няма яшчэ рэзультатаў выбараў у 2 унівэрсытэцкіх акругох, але справа йдзе толькі аб некалькіх мандатах, якія ня зьменяць адносшаньня сілаў у парляманьце.

Самапачуцьцё рэспубліканскай апазіцыі выявілася ўжо ў заяве павадыра яе дэ Валеры аб тым, што рэспубліканцы ня будуць прысягаць на вернасьць каралю, але на вернасьць Яго Вялічаству Ірлянскаму Народу.

Агульнае адступленьне арміі Чанг-Тсо-Ліна

Агульнае адступленьне, амаль ня ўцёкі, арміі Чанг-Тсо Ліна выклікае страшэнную паніку ў Пэкіне і Мукдэне. Сталіца сьпешна эвакуіруецца. Чужаземная частка места робіцца запраўднай крэпасьцяй. Навакол яе закапаны ў зямлю міны. Чанг-Тсо-Лін, каб дадаць духу сваім прыхільнікам ды страху сваім ворагам, абвясьціў сябе дыктатарам і вярхоўным камандзірам усіх арміяў, якія ваююць проці паўдзённых арміяў. З гэтага ясна, што ўсе чуткі аб нейкіх перагаворах ды паразуменьні між Чанг-Кай-Шэкам і Чанг-Тсо-Лінам пакуль-што ня маюць у сабе праўды.

Голас моладзі.

П-ну Астроўскаму
ў Вронкаўскі вастрог
ад абітур'ентаў Віл. Бел. Гімн.

Глыбока паважаны гр. Астроўскі.

Ужо хутка мінець паўгоду, як нас разлучылі, аднак памятка аб Вас засталася і застанецца ў нас на ўвесь час нашага жыцьця. Мы не забудзем таго аграмаднага значэньня Вашае працы, якую Вы ўлажылі ў нас.

Цяпер, калі мы стаім на парозе да новага жыцьця, калі можа назаўсёды разьвітаемся з школьнаю лаўкаю, мы абітур'енты выражаем шчырую падзяку за ўсе Вашыя высілкі, паложаныя для нас вучняў-дзяцей працоўнага сярмяжнага народу.

Хаця Вам не далі прадаўжаць гэнае працы, хоць нас ізалявалі ад Вас, мы, моладзь, ужо добра зразумелі значэньне яе, і ня зойдзем з таго шляху, на які Вы нас паставілі.

Мы будзем прадаўжаць гэную працу!

Мы дружна возьмем у свае рукі тую ліхтарню асьветы, якую Вы запалілі, і панясем яе ўва ўсе цёмныя куты загнанага народу.

Праўда, на нашым шляху шмат равоў і розных перашкодаў, аднак, мы ня спужаемся іх і цьвёрда верым, што настане хвіліна, калі мы ўбачым вынікі нашае працы, калі народ ня будзе далей цягнуць ярма, наложанага на яго вякамі, калі парвець путы, трымаўшыя яго ў цемры і ня будуць яго дурманіць „цёмных дарог махляры“.

Сяньня ў нас разьвітальны вечар. Мы сабралісь усе, каб адсьвяткаваць гэты традыцыйны дзень, аднак нейкі сумны настрой сярод вучняў. Дый як-жа ім весяліцца? Дзьверы да вышэйшае асьветы зачынены, а матэр'яльнае становішча не дазваляець ім ехаць заграніцу.

А вучыцца трэба!

Ці-ж прыходзіцца нам стаяць на раздарожжы і чакаць лепшае будучыні і на лепшыя абставіны?

Не!

Мы чакаць ня будзем, мы самі здабудзем яе сваімі высілкамі, і толькі сьмерць нас можа ўстрымаць ад працы на карысьць загнанага народу.

Няхай-жа будзець вядомым, што мы не забылі Вас і Вашае працы, што дух, які Вы ў нас улажылі жыве і будзе жыць сярод нас!

Выражаючы глыбокі спагад і шчырую падзяку, жадаем, каб у хуткім часе спаткаліся з Вамі ўжо ў іншых абставінах, каб не аддзялялі нас вастрожныя краты ад чалавека, які так добра памятаў аб нас.

Падпісы:

1) Казлоўская Аўгеньня, 2) Яцкевіч Мікола, 3) Шчасны Пётра, 4) Войцеховіч Зьдзіслаў, 5) Хворас Янка, 6) Шышко Уладзімір, 7) Скурка Мар'я, 8) Мамчыц Ксенія, 9) Рышкевіч Зінаіда, 10) Грыц Зоя, 11) Озік Роза, 12) Ільляшэвіч Хведар, 13) Цытовіч Леванід, 14) Чаровіч Казімір, 15) Шутовіч Вайцех, 16) Будзька Ірэна, 17) Зімніцкая Каліса, 18) Асаевіч Софія, 19) Муха Айша і 20) Грыгорук Іван.

P. S. Дзеля таго, што абітур'ент Аляксей Салагуб арыштованы і сядзіць у вастрозе, подпісу яго не падаем.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаная Рэдактарка!

Дазвольце зьмясьціць у Вашай часопісі гэтыя некалькі слоў.

У № 18 „Нашае Праўды“ я спраставаў рад паданых у „Сял. Ніве“ паслом Рагуляй і ягонымі кумпанамі ілжывых „фактаў“ аб маей нібы то антыграмадзкай дзеяльнасьці. Але „Сял. Ніва“, павырываўшы часткі фраз і паадзінокія словы з майго пісьма, якое вычэрпываюча запярэчыла нягоднай ілжы, паўтарае далей, быццам я „прызнаўся“ да ўсіх гэных брудаў, выдуманых здэмаскаванымі ўжо „павадырамі“ „Сельсаюзу“. Такі спосаб палемкі „Сял. Нівы“ раўназначны з пастулкам чалавека, які фальшуе дакумэнты, і заслугуе на глыбокую пагарду з боку кожнага чэснага чалавека.

Не магу тут моўчкі прайсьці міма выступленьня майго палітычнага праціўніка, але—відаць—асабіста чэснага чалавека, палк. Канапацкага. Гэты былы галоўна-камандуючы беларускіх вайсковых аддзелаў, створаных п. Пілсудзім, у сваім пісьме ў „Бел. Сл.“ рашуча сьцьвярджае брахлівасьць заявы п. Рагулі, быццам я „зацьвярджаў“ форму для гэных аддзелаў... А хіба ж у гэтым пытаньні няма нікога лепш асьвядомленага, чым п. Канапацкі!

Палемізаваць далей з „Сял. Нівай“ і яе кіраўнікамі ня зьбіраюся. Буду толькі—калі далей яна будзе фальшаваць гісторыю нашага адраджэнскага руху—праставаць факты, што рабіў і дагэтуль. **Ант. Луцкевіч.**

Вільня, 18. VI. 27 г.

Ад Рэдакцыі. Зьмяшчаючы гэтае пісьмо грам. Луцкевіча, лічым патрэбным далучыць да яго і тэкст пісьма грам. Канапацкага, на якое грам. Луцкевіч пазываецца. Вось яно:

У № 18 „Нашай Праўды“ п. Антон Луцкевіч, адказваючы на закіды пасла Рагулі між іншым кажа, што ён формы для беларускага войска не зацьверджываў. У імя справядлівасьці мушу сьцьвердзіць, што ўласьне і ёсьць так — п. Антон Луцкевіч ніякай формы не зацьверджываў і наагул да фармаваньня беларускіх аддзелаў пад Польшчай адносіўся няпрыхільна.

Але ў 1919 г. ў Варшаве, калі я апрацоўваў праекты гэнае формы, то праўда не аднаразова радзіўся з п. Луцкевічам і радзіўся толькі ў сэньсе нацыянальных адзнакаў формы, сама-ж форма была зацьверджана тагачасным Міністрам Вайсковых Спраў Гэнаралам Сосенкоўскім. **Г. Канапацкі.**

Паважаная Пані Рэдактарка!

Не адмоўце зьмясьціць у Вашай Паважанай Газэце ніжэй паданае: У № 17 газэты „Наша Праўда“ была зьмешчана карэспандэнцыя пад загалоўкам „Поп і народ“, у якой былі нападкі на чарнеўіцкага сьвяшчэньніка Сіняўскага, што ён забраў сабе ўсю Плашчаніцу. Я як царкоўны староста, і таму стоячы блізка да ўсіх царкоўных спраў, мушу сказаць, што нападкі гэтыя ёсьць беспадстаўныя, бо крыюць у сабе няпраўду. Сьв. Плашчаніца прастаяла ў нашай царкве ад Вялікай Пятніцы да поўначы Сьветлай Ночы і за ўвесь гэты час там было сабрана: ў Вялікую Пятніцу—5 зл. 67 гр., у суботу—4 зл. 52 гр., ў Сьв. Ноч—10 зл. 47 гр. Усе гэтыя грошы (разам 20 зл. 62 гр.) мною самім своячасна былі паложаны ў царкоўную скарбніцу. Так што карэспандэнцыя, гаворачая аб тым, што сьвяшчэньнік наш забраў усе гэтыя грошы сабе,—падае няпраўду.

Што-ж тычыцца пабораў сьвяшчэньніка за трэбы,—дык такія бяруцца не па назначэньню апошняга, а па добрай волі саміх прыхаджан.

Прыміце ад мяне, Пані рэдактарка, выразы пашаны да Вас

Хвёдар Карзёнак—царкоўны староста.

Ад Рэдакцыі, да ведама Усіх карэспандэнтаў: вельмі няпрыемна рэдакцыі зьмяшчаць тыя карэспандэнцыі, у якіх ёсьць нешта няпраўдзівае, але наперад ведаць, ці падаваная карэспандэнцыя праўдзівая, ці не,— рэдакцыя ня можа, дык усякую карэспандэнцыю зьмяшчае, на маральную адказнасьць саміх карэспадэнтаў. Рэдакцыя думае, што карэспандэнты—гэта лепшая частка грамадзянства, гэта тыя, што ня могуць пераносіць усякага зла, няпраўды ды надужыцьцяў, гэта тыя, што ходаюцца за праўду і справядлівасьць. Дык вельмі прыкрымі зьяўляюцца выпадкі, калі карэспандэнт, па тых ці іншых прычынах, напісаў няпраўду і такім чынам выклікаў на няпрыемнасьць рэдакцыю газэты. Таму зьвяртаемся з просьбай да ўсіх сваіх карэспандэнтаў, каб падавалі ў сваіх карэспандэнцыях толькі праўдзівыя, добра праверадныя факты, а не якісь там чуткі, ці навет і паклёп, як рэзультат сваіх асабістых непаразуменьняў з асобай, аб якой гаворыцца ў карэспандэнцыі. У апошніх выпадках карэспандэнцыі прыносілі-бы толькі шкоду газэце, грамадзянству, а навет і самому карэспандэнту. **Рэдакцыя.**

З жыцьця Горадні.

× **Камуністычныя выступленьні.** З прычыны забойства радавага пасла ў Варшаве Войкова ў ноч з 9 на 10 чэрвеня па ўсяму гораду былі параскіданы камуністычныя літэратуры-адозвы, а ў некаторых пунктах места, як пл. Баторага, вул. Замковая, Пагулянка, былі павывешваны вялікія чырвоныя сьцягі. **Молат.**

ХРОНІКА.

Выключэньне Рагулі, Ярэміча і Більдзюкевіча з „Сялянскага Саюзу“. Група закладчыкаў „Сялянскага Саюзу“, які быў створаны ў Празе Чэскай яшчэ ў 1922 годзе, выключыла з партыі самачынных павадыроў „Саюзу“ — Рагулю, Ярэміча і Більдзюкевіча. Падробнасьці гэтае цікаўнае справы падамо ў наступным нумары.

Да самаўрадавых выбараў. У Баранавічах — з ініцыятывы грам. Аўгена Міткевіча — выйшла аднаднёўка пад назовам **„Самаўрад“**. Аднаднёўка зьмяшчае рад інструкцыяў і важнейшыя правілы аб тым, як адбываюцца выбары. Выдаўцы абвяшчаюць, што з паўлюкевічавым „Цэнтральным Нацыянальным Выбарным Камітэтам на Віленшчыну і Наваградчыну“ яны нічога супольнага ня маюць.

Ізноў арышты беларускіх вучняў. Надовячы ў Вільні паліцыя пeратрасла хаты і заарыштавала матурыста Віленскае Беларускае Гімназіі Хвёдара Ільляшэвіча і вучня 5 й клясы Багдановіча. Прычына арышту — няведамая.

Ільляшэвіч — адзін з здальнейшых сёлетніх матурыстаў і здольны малады паэт.

Разьвітаньне вучняў з гімназіяй. 15-га чэрвеня вучні Віленскае Беларускае Гімназіі, якія скончылі 7 і 8 клясу, сабраліся разам з сваімі настаўнікамі, каб разьвітацца. За скромнай вячэрай (ведама, без гарэлкі!) гадунцы гімназіі абменіваліся шчыра думкамі аб сваей далейшай працы і жыцьцёвым шляху. У-ва ўсіх відаць было гарачае жаданьне быць карыснымі свайму працоўнаму беларускаму народу і правясьці ў жыцьцё тыя высокія ідэалы, якія яны вынясьлі з сабой з гімназіі. Дзякуючы сваім узгадавальнікам за іх працу, вельмі шчыра ўспаміналі вучні свайго былага дырэктара Астроўскага, які знаходзіцца ў вастрозе ў Вронках. Горача адказвалі ім дырэктар гімназіі грам. Трэпка і рад настаўнікаў, а такжа старшыня бацькаўскага камітэту, грам. Кэпель. Вучыцель лацінскае мовы, грам. Абрамовіч, разьвітваўся з сваімі вучнямі лацінскай прамовай.

Пасьля вячэры вучні і вучаніцы дэклямавалі беларускія вершы — чужыя і свае ўласныя, а такжа пяялі беларускія песьні. Закончылі вечар танцы.

Разьвітаньне гэтае пакінула па сабе дужа мілае ўражаньне: яно паказала, якая цесная ідэйная сувязь істнуе паміж моладзяй і роднай гімназіяй. Заслуга ў гэтым—добрага ідэйнага кіраўніцтва.

Папраўка. У сувязі з перадвыбарнай гарачкай, у апошніх нумарох нашае газэты ўбілася некалькі прыкрых хібаў і абмылак, якія папраўляем. Гэтак у № 20, часовы заступнік радавага пасла ў Варшаве Ульянаў названы „Уладзімерам“ замест **Аляксандра.** Ізноў-жа ў № 21 у фэльетоне аб Барысе Кавэрдзе асталіся нявыкіненымі некатарыя выражэньні, якія ня былі прызначаны да друку. Урэшце, у тым жа № 21 у заметцы „Расстрэл 20 манархістаў у СССР“ пераблутаны словы камунікату маскоўскага радыё і словы апрацоўваўшага заметку працаўніка газэты (у першым адрыўку), які злучыў камунікат з іншымі газэтнымі весткамі.

Афіцыяльны курс грошы на 21 чэрвеня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

21./VI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Ідэйныя сельсаюзьнікі аб новай правакацыі „Сялянскае Нівы“.

Аднаднёўка **„Народ“** надрукавала паміж іншым характэрную заметку пад загалоўкам „Удаюць“, у якой выяўляе новую правакацыю, учыненую кіраўнікамі „Сялянскае Нівы“. Чытаем тамака:

„Ворган Ф. Ярэміча, В. Рагулі й А. Більдзюкевіча (яны складаюць прэзыдыум Ярэмічавага „Саюзу“) „Сялянская Ніва“ ў № 45 сёлета піша: „гр. Янка Станкевіч, ужо з благаславенства А. Луцкевіча маніцца таксама залажыць нейкую быццам сялянскую партыю“.

„Закладаць новай партыі Я. Станкевіч не патрабуе, бо Беларускі Сялянскі Саюз, каторы ён разам з іншымі залажыў, існуе без перарыву ўжо пяць год. Але пісаньне аб „благаславенстве“ Луцкевічавым вельмі нягодна характарызуе вышменаваных паноў. Як ведама, яны ўвесь час пісалі, што А. Луцкевіч стварыў „Грамаду“, кіраваў ёй і цяпер быццам рэдагуе „грамадаўскаю“ газэту, хочучы, пэўне ж, гэтым прывесьці арышт А. Луцкевіча польскай уладаю. Цяпер яны ўлаюць, што з „благаславенства“ Луцкевічавага працуе Беларускі Сялянскі Саюз, хочучы, відаць, і нам таго самога, што й Луцкевічу. На гэта ім адкажам словамі поэты:

Ня толькі „хамскія“ натуры
На карках вынесьлі сваіх
І сьвіст даношчыкаў пануры,
Паверце, не запудзіць іх.

Напасьцяй, лаянкай напраснай
Грудзёў ня варта мазаліць,
Не пагасіць вам праўды яснай,
Жыў Беларус і будзе жыць“.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Раньнія ластаўкі.

(З Беласточчыны).

У Беластоцкім ваяводзтве распушчаны ўсе мястовыя і гмінныя рады, апроч Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў. Карыстаючы з гэтага, аўтары тайных мэмарыялаў з сельсаюзьніцка-дэфэнзыўнага лагеру, каб разьбіць адзіны сялянска-работніцкі фронт на выбарах у мястовыя рады і гмінныя самаўрады, зачалі цягацца па гэтых вось паветах і, нешкадуючы, як заўсёды, пекных слоў, нібыто мёдам шмараваных, ды сулячы розныя ласыя рэчы, зачалі нашчупваць грунт дзеля распачацьця сваей спэкулянцкай „працы“. Ды так спрытна зачынаюць да цябе падходзіць, так хітра прамаўляць, што, ня ведаючы іх, мала сьвядомы палітычна чалавек, гатоў ім паверыць, дый і на думку яму навет ня прыйдзе, што гэта ёсьць спрытны падход палітычнага спэкулянта, служкі буржуазіі, які, заманўшы цябе ў расстаўленыя ім сеці, аддае пад бот пана.

Але гэтак была можна ашукаць беларускія працоўныя масы калісь. Цяпер інакш. І вось, паны Ярэмічы, Рагулі і К о, зблякаваныя з расейскімі манархістамі, ведайце, што сёньня беларускія працоўныя масы ня пойдуць за рознымі вашымі абяцанкамі! Узрост палітычнай і нацыянальнай сьвядомасьці ў гэтых масах ужо выразна прамаўляе за тое, што вельмі цяжка будзе пацягнуць масы за сабой, апроч тэй малай жмені збанкрутаваных „вялікіх“ і малых дэфэнзыўных дзеячоў, якіх беларускія працоўныя масы, як здраднікаў работніцка-сялянскай ідэалёгіі, павыкідалі з сваіх радоў. Вы гэта і самі добра ведаеце з практыкі, калі рабілі

спробы, пасылаючы сваіх агентаў у гэтыя паветы — дзеля залажэньня сельсаюзаў; бо-ж спробы вашыя так і засталіся спробамі, а беларускі працоўны народ ня дасьць сябе ўжо ашукаць: ён стане адзіным фронтам поплеч з працоўнымі другіх нацыянальнасьцяў і будзе змагацца і вясьці барацьбу проці „родных“ і чужых ашуканцаў, за ўладу сялян і работнікаў, за родную школу, за дапамогу безработным, за дзяржаўную дапамогу культурна-асьветным і прафэсыянальным арганізацыям, за бясплатнае ўдзяленьне памешканьняў безработным і разбудову работніцкіх дамоў коштам дзяржавы, за звальненьне сялянскай бедваты ад падаткаў, за зямлю бяз выкупа для працоўнага сялянства, ды за сялянска-работніцкую еднасьць!

Молат.

Культурная праца.

(Навагрaдзкі пав., Гарадэчанская гміна, вёска Карастава).

12-га чэрвеня на Сёмуху сябры Навагрaдзкага Гуртка Т-ва Бел. Школы зладзілі спэктакль-вечарыну ў в. Карастава; згулялі камэдыю: „Модны Шляхцюк“ — Каганца і жарт „Пасланец“ — Родзевіча. Сцэна была збудавана ў гумне на скорую руку, але выглядала вельмі добра. Першую адыгралі камэдыю „Модны Шляхцюк“. Дужа добра гулялі артысты: у ролі бацькі — Грыгор Скобля, у ролі Ганначкі — Альжбета Маркевіч і Моднага Шляхцюка — Мацей Басараб. Жарт „Пасланец“ быў згуляны таксама добра. Нагул усе артысты выпаўнялі свае ролі дужа добра, ня гледзячы на тое, што ніхто з іх раней ня выступаў на сцэне. Былі і дэклямацыі вершаў, закончыўся вечар скокамі. Прысутных было многа, збор быў добры, ўвесь даход пашоў на карысьць Т-ва Белар. Школы ў Навагрaдку. Было-б яшчэ больш глядзельнікаў, каб не перашкодзіла навальніца, якая была перад спэктаклем. Прысутныя, пераважна з сваей і ваколічных вёсак, былі вельмі зацікаўлены, казалі, што мала, прасілі ладзіць такія вечары балей. Але ня абышлося ў сям'і бяз уродаў. Некалькі мужчын гэтае вёскі Карастава не пашлі на спэктакль, а гралі ў карты і калі сьвядомы сябра Гуртка Т-ва Бел. Школы Гальяш Антончык зашоў паклікаў іх на спэктакль — дык „карцёжнікі“ аблаялі яго і выгналі з хаты. Памятайце, грамадзяне, што ў карты долі ня выграеце.

Солтыс гэтае вёскі прышоў праверыў, ці ёсьць дазвол на спэктакль, але ён, мусіць, думае, што паном служыць, а не свайму Беларускаму грамадзянству, бо на спэктаклі не застаўся — баяўся.

Ганьбя вам, карцёжнікі, і табе несьвядомы солтыс!

Вялікая і шчырая падзяка, гр. Мацею Басарабу, які ня толькі выпаўніў ролю Моднага Шляхцюка, але гэтаксама выпаўніў ролю сьвядомага і шчырага сына нашай працоўнай Беларускай сям'і, пусьціў у свае гумно і даў увесь патрэбны матэрыял для ладжаньня сцэны і сядзеньняў. Падзяка музыкантам, якія гралі на вечарыне, і артыстам за іх ахрярную працу. Пасьля тыднёвае працы замест адпачынку сабіраліся ў нядзелі на рэпэтыцыі, а некатарым прыходзілася хадзіць аж за 7 вёрст.

Падзяка ўсім тым, хто хоць чым дапамог у ладжаньні спэктаклю. Пашана Вам, „сяўбіты прышласьці яснай“.

Ладзьце балей свае Беларускія спэктаклі і вечарыны, гэтым мы пакажам, што; „Не загіне край забраны, пакуль мы яшчэ жывём“.

Прысутны Сябра.

„Мы не павінны верыць, што ня будзе сьвету, ня будзе дня“.

(В. Запольле, Пачапаўскай гм., Навагр. пав.).

Таксама, як летась і пазалетась, і ў гэтым годзе 24 красавіка (на другі дзень Вялікадня) і 15 траўня, наша вясковая моладзь ладзіла спэктаклі, ігралі п'есы: драму „Апошняе Спатканьне“ і камэдыю „Зьбянтэжаны Саўка“. Публікі, як першы, так і другі раз, было поўны будынак, некатарыя прыходзілі за 10 верст, каб толькі паглядзець на прадстаўленьне ў роднай мове. Другім разам прышло навет усё тутэйшае польскае вучыцельства. Ня лічучы некатарых заган, бяз якіх на вёсцы трудна абыйсьціся, п'есы нагул былі згуляны вельмі добра, публіка зусім была задаволена, навет сярод быўшых на спэктаклю палякоў (вучыцялі і паліцыя) можна было чуць словы: „bardzo dobrze“ — „porządnie“. У часе гульні п'есы „Апошняе спатканьне“ былі такія мамэнты, што ўзварушвалі ўсю публіку і хацелася крыкнуць разам з студэнтам Дзіўным на ўсю Беларусь на ўвесь сьвет, што „Мы не павінны верыць, што ня будзе сьвету, ня будзе дня“!

На спэктаклі ня відаць было п'яных — быў поўны парадак. Чысты збор пойдзе на бібліатэку ў Запольлі.

Успамінаючы аб гэтым сьвятым зьявішчы для нас, як тэатр на вёсцы, не хацелася-б прыпамінаць аб такім брудзе і брыдзе, што рабілі ў дні спэктакляў некатарыя нашы вясцовыя хлопцы: Каршун Васіль, Юрчык Алёшка, Слесарчык Васіль (сын Раманка), Гукіш Сымон (сын Анішкі). Юшкевіч Анцік і Шпень Язэп. У дзень спэктаклю на другі дзень Вялікадня яны завялі вечарынку ў Максіма Цімашка, напіліся п'яныя, заблявалі ўсю вуліцу, пабіліся, патаўклі добра бакі свайму-ж сябру Івану Раўлушчыку, а хто йшоў на спэктакль, яны затрымоўвалі і сілаю валаклі на сваю п'яную вечарынку, а дзяўчатам проста пагражалі кулакамі. Гэтак сама яны зрабілі і на другі спэктакль з тою толькі розьніцаю, што яшчэ горш заблявалі вуліцу, ды адзін чужы хлапец, якога яны затрымалі на вуліцы і ўгаварывалі ня йсьці на спэктакль, адному з гэтых даўбакоў заплюваў вочы. Успомненыя хлопцы гэта гнойны струп нашай вёскі, іх немагчыма пераканаць, што сонечны дзень сьвятлейшы за цёмную ноч, што тэатр — гэта школа для народу, дзе выстаўляюцца на суд публікі добрыя і благія бакі нашага жыцьця, што тэатр лепей за п'яную вечарынку. Але на вечарынцы ім вясялей; там яны могуць даць волю сваей дзікай натуры, абрахаць кожнага, сколькі ім захочацца, ды яшчэ настрашыць, што „задамо“. Гэта рабы, якія з прыемнасьцю здымаюць шапкі перад панам, і з вялікім смакам могуць аблізаць яму руку.

Яшчэ адзін гнойны струп ужо на ўсю парахвію гэта наш поп Марцін Савіч, быўшы чарнасоценец уздыхаючы аб салодкіх для яго Мікалаеўскіх часах, які таксама ўгаварваў першага ўстрэчнага, каб ня йшоў на спэктакль, але маральнасьць гэтага чалавека ведамая (ня раз пісалася пра яго ў газэтах) і ня варта яго імям паскудзіць шпальтаў газэты, бо яго справіць хіба толькі магіла, чаго жадаюць даўно ўсе парахвіяне.

У заканчэньне скажу, што цемната гэта злейшы вораг нашай вёскі і мы павінны з ёю бароцца ўсялякімі спосабамі, а на такіх струпоў, як поп Савіч, мо' знойдзем лякарства, каб зьвясьці іх са здаровага цела Беларусі, каб яны не тармазілі культурнай працы Беларускага народу!

Гэтыво.

Зьверства абшарніка Гектара Райскага.

(Мядзведзіцы, Баранавіцкага пав.).

У дзень 27 траўня на нашым уласным выгане, але цяпер ужо адсуджаным праз абшарніка пры польскім урадзе, здарыўся гэткі выпадак: раніцай 27-га траўня г. г. абшарнік з маёнтку Запольля Гэктар Райскі выйшаў на дарогу з штуцарам і, ўбачыўшы, што на спорным выгане пасуцца коні, нікому нічога ня кажучы, давай страляць проста ў коні; вынікам гэнай стрэлянiны сталася тое, што раніў чацьвёра каней, адна кабыла дастала аж дзевяць куль, другая чатыры кулі і дзьве па адной кулі. Тая, катора дастала 9 куль, на трэцьці дзен здохла, а астатнія трое яшчэ клеваюць, хоць ужо з іх малая карысьць. Дык вот, дарагія браточкі, як абшарнікі паступаюць з беднымі людзьмі, а абшарніка дык ніхто на'т і на дапрос не патрывожыў.

Цяпер, дарагія чытачы, апішу, які гэты выган. Ад сотні гадоў нашы дзяды можа і прадзяды і таксама бацькі карысталі з гэтага выгана, ёсьць яго 36 дзесяцін, дык, як прышлі польскія ўлады, абшарнік задумаў, каб адсудзіць гэны выган і падаў у суд. Дзівіцпа трэба браточкі: вашых 24 сьведкі нічога не памаглі, а яго нейкія пісулькі, што ён сам панапісваў, быццам капаў канавы, карчаваў і г. д., і што вы скажыце, узяў ды адсудзіў. Але сяляне, ня трацячы часу, падалі ад сябе ў суд, каб разглядзелі на-нова гэту справу. Усё роўна, абшарнік Гэктар Райскі ні на што не глядзіць і коні страляе, яшчэ казаў пры гэтым выпадку, калі сяляне спыталіся: што, паночку, за што-ж страляеш нявінную скаціну, дык ён, запеніўшыся, як дзік, давай крычаць: „мільчэць хамы, а то і вас пастраляю! я мам позволене ад вышэйшых уладаў. Дык вось, браточкі грамадзяне, у якіх варунках мы жывём.

Няшчасны.

„Міласьцівы“ ацец.

(Хаценчыцы, Вялейскага павету)

11 траўня г. г. конь удавы Зосі Дзік узыйшоў на голае іржышча папа Хвядоса Макара, каторы, угледзіўшы гэта, кінуўся забіраць у хлеў гэтага каня. Бачучы, як поп палюе на каня, гэта бедная ўдава таксама кінулася не даваць свайго каня. Але поп пабіў у гэтым рэкорд: каня забраў і патрэбаваў 10 злоты адразу, і сказаў, што, калі не аддасць, дык [illegible] у суд — Бедная жанчына прасіла, маліла радзі Хрыста дараваць [illegible] ей гэты „праступак“, кажучы, што шкоды ня зроблена навет і на 3 грошы, але гэты „міласьцівы“ ацец так „возлюбіў бліжняга свайго“, што гатоў садраць у сваей авечкі скуру, і не аддаў ей каня дарма. — Тагды удава зьвярнулася за парадай да аднаго паважнага чалавека, каб той уступіўся за яе ў гэтай справе. Чалавек гэты напісаў папу пісьмо, просячы дараваць радзі Хрыста „праступак, беднай удавы і аддаць бясплатна ей каня, на што поп з вялікім трудом згадзіўся, вылаяўшы гэтага абаронцу і ўсё-ж такі патрэбаваў, каб удава прывяла 2 сьведкаў і расьпісалася (чуць не сваею крывёй) што больш ніколі (навет і за 100 гадоў!) конь яе ўжо ня ўзыйдзе ні на іржышча, ні на мяжу ні на попову дарогу!

Відзячы такое брыдкае адношаньне гэтага „айца духоўнага“, удава ўспомніла тутака яму пра падпіску прыхаджан за яго, кажучы так: „вот бацюшка які, а людзі за бацюшку падпісываліся“, на што ён вылаяўся мацягвуўшы. Цяпер паважаныя чытачы і слухачы гэтай газэты трэба ведаць, што гэта за падпіска была.—Справа вось была якая: Служылі ў папа Макара Хвядоса работнік Вінцук Забаронак і работніца Вольга Доўгая з м-ка Ільлі. Раптам у гэтай служанкі нарадзілася дзіця. Матка схавалася. Забаронак падкінуў гэта дзіця папу кажучы, што дзіця гэта папова, а поп, падкідаючы яго парабку Забаронку, казаў, што яго дзіця — словам, як у біблейскай гісторыі, з той толькі розьніцай, што там 2 жанчыны адказываліся ад мёртвага дзіцяці, а тут 2 мужчыны ад жывога. — Справа разыгралася не на жарты; была замешана паліцыя Хаценчыцкага пастарунку у бяздзеяльнасьці з боку папа, а з боку паліцыі поп візаваціўся ў абразе гэтай паліцыі і г. далей; нашліся староньнікі папа, і староньнікі паліцыі—словам, злажыліся 2, процілежныя лагеры (чуць ня так як Чанг-Кай-Шэк і Цанг Се Лін)—і так справа стаяла на мёртвым пункце цэлы тыдзень, а дзіця ўсё насілі то папу то парабку, пакуль бедненькае не аддала Богу душу. Як жыло яшчэ гэта дзіця, адзін раз у нядзелю ў царкве поп гэты, трымаючы крыж у руках, стаў галосна крычаць, клясьціся, плакаць што „вóроны кружатся над нашим Храмом і моею головою“. Гэта значыць, што дзіцем яго хацелі скампрамітаваць, яго ўдаліць, а царкву зачыніць. Чалавек ня камень: пачуўшы гэта, добрыя людзі ўступіліся за папа, а іменна тут-жа была падпісана тэлеграма пану Пракурору Віленскага Акружнага Суда і прашэньне Архірэю. Паехаў з гэтымі паперамі поп асабіста ў Вільну; што ён там зрабіў мы, вядома, ня ведаем, але вярнуўся адтуль вясёлым. Цяпер усё гэта ўжо сьціхла, але 9 чалавекам, заступіўшымся за папа няма праходу ад усяго прыходу; каторыя паступаючы па прыказцы „свой з сваім біся, а чужы не мяшайся“, нявольна нажылі за свой паступак агульны прыхадскі прысуд і каторых сам ацец Макар багаслаўляе, як мы ўжо сказалі—мацюгамі.

Агульныя жаданьні ўсяго прыходу: каб пачуў гэта Уладыка наш і забраў ад нас гэту кузурачку, бо пісаць прашэньня да Уладыкі мы ня сьмеем дакучаць так часта, а другая прычына тая, што нам прысылаюць сьвяшчэньнікаў, што далей дык усё горшых.

Тойсамы.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца на мясцох.

29 траўня Скідэльскім Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў м. Скідлі Горадзенскага пав. з прычыны 10 угодкаў сьмерці Беларускага песьняра **Максіма Багдановіча** быў зладжаны памінальны вечар, на які, каб ушанаваць сваей прысутнасьцю, назыходзілася шмат сяброў Т-ва з акалічных вёсак. Прадстаўнік Горадз. Акр. Управы прачытаў рэфэрат аб жыцьці і творчасьці вялікага паэта-мастака **М.** Багдановіча, і з яго ўсе прысутныя зразумелі, якую вялізарную паносяць утрату ў асобе М. Б., без пары памёршага на чужыне.

* * *

× **У вёсцы Дубно**, Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Дубнаўскага Гуртка Т-ва Беларускае Школы 12 чэрвеня была пастаўлена п'еса Вясёлага „Ня разумам сьцяміў, а сэрцом“. Даход назначаны на карысьць бібліатэкі-чытальні.

* * *

× **У вёсцы Пяшчанка**, Горадзенскага п., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы 12 чэрвеня былі пастаўлены п'есы „У кавалёвай хаце“ Л. Радзевіча і „Ня разумам сьцяміў, а сэрцам“—Вясёлага; даход пайшоў на карысьць бібліатэкі-чытальні.

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАУШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДАМ.

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.